# Самапомач
# Samapomač

Беларуская кооперацыйна-гаспадарчая часопісь


| Год II. | Вільня, Ліпень - Жнівень 1933 г. | № 7-8. |
|---|---|---|



*Хай злыдні над намі,*
*скрыгочуць зубамі*
*Любі сваю ніву, свой*
*край,*
*І, колькі ёсьць сілы,*
*да самай магілы*
*Ары, барануй,*
*засявай!..*

ЯНКА КУПАЛА.



*Усе вялікія падзеі народаў і ўсе цывілізацыі былі створаныя дабравольнымі стараньнямі аб'яднаных людзей... самапамаччу*

*Джордж РЭССЭЛЬ.*
*(Ірляндзец).*



## ЗЬМЕСТ № 7-8 (10 11)



## BIEŁARUSKAJA ABECEDA.

Беларуская абэцэда.

| | | | |
|---|---|---|---|
| A, a — А, а. | H, h — Г, г. | Ł ł, — Л, л. | S, š — Ш, ш. |
| B, b — Б, б. | Ch, ch — Х, х. | M, m — М, м. | T, t — Т, т. |
| C, c — Ц, ц. | I, i — І, і. | N, n — Н, н. | U, u — У у. |
| Ć, ć — ЦЬ, ць. | J, j — Й, й. | Ń ń — НЬ, нь. | Ŭ, ŭ — Ў, ў. |
| Č, č — Ч, ч. | Ja, ja — Я, я. | O, o — О, о. | V, v — В, в. |
| D, d, — Д, д. | Je, je — Е, е. | P, p — П, п. | Y, y — Ы, ы. |
| E, e — Э, э. | Ju, ju — Ю, ю. | R, r — Р, р. | Z, z — З, з. |
| F, f — Ф, ф. | K, k — К, к | S, s — С с | Ž, ž — Ж, ж. |
| G, g — Г, г. | L, l — ЛЬ, ль. | Ś, ś — СЬ, сь. | Ź ź — ЗЬ, зь. |



UVAHA: Pry niedaručeńni vypisanaj hazety z pošty treba zaraz-ža žadać vyjaśnieńnia na tej ža pošcie. I tolki ŭ razie, kali b heta nie pamahło, treba zaraz-ža ab usioj spravie napisać u administracyju „Samapomačy“. Padać pry hetym treba: kali (dakładna padać datu), čamu na jakoj pošcie i jakoha numaru časopisi nia možna było atrymać. Biaz hetycch danych zamienny numar „Samapomačy“ vysyłacca **nia budzie.**

*Administracyja „Samapomačy“.*

Saмapoмač

Adres:
VILNIA (Wilno), Połackaja vul. 4—10.

BIEŁARUSKAJA
KOOPERATYŬNA - HASPADARČAJA
ČASOPIŚ.

Самапомач

| Hod II. | Vilnia, Lipień-Žnivień 1933 h. | Nr 7-8 (10-11). |
| --- | --- | --- |

## NIE ZĄ RAZ VILNIU ZBUDAVALI!

Adnej z adznakaŭ hramadzkaj śpiełaści čałavieka — i hramadzianstva — jość jahonaja vytrymanaść. Vytrymany čałaviek nie asudzić inšaha čałavieka, abo niejkaje źjavišča, napierad jaho nie paznaŭšy; nia ličyć na čužuju dla siabie pomač bolš, čym sam bližniamu pamahaje; viedaje, što vialikija spravy takimi nie paŭstajuć, ale raźvivajucca z małoha zdarovaha zarodka *pry vytryvałaj pracy z vieraj u ŭdaču.*

Hetaha apošniaha, h. zn. vytryvałaj pracy i viery ŭ udaču vielmi časta nie chapaje našamu biełaruskamu hramadzianstvu i tamu ŭ nas hetak ciažka pryjmajucca roznyja, u hruncie rečy najlepšyja pačynańni. Tut taksama najčaściej lažyć pryčyna, čamu tak byccam pa hrudzie ŭ sanioch idzie ŭ nas sprava zasnoŭvańnia i ŭtrymyvańnia svaich kooperatyvaŭ, choć dahetul usie zhodny ŭ tym, što kooperacyja nam hetak vielmi patrebna. Jość tut, praŭda, i pryčyny inšyja, mo' navat bolšyja, pryčyny pasiaredniaha i biespasiaredniaha ŭpłyvu čužoj nam i varožaj palityki. Ale ab hetym tut nie havoram, tut majem na ŭviecie pryčyny tak-by nazvać našy psychična-moralnyja, što ŭ nas samych majuć svoj pačatak i na našu-ž škodu dziejuć.

Zasnoŭvańnie takoj ci inšaj kooperatyvy dziejecca ŭ nas zvyčajna pad upłyvam namovy, a jašče čaściej — „pierasolenych" abiacanak ab karyściach. Nia dziva tady, što ŭ paniaćci zvyčajnaha novanaviernienaha „kooperatysta" što jak što astajecca ŭ pamiaci, ale paniaćcie i žadańnie hetaj karyści — u volnaj fantazii jšče pavialičanaj—napeŭna ŭsio pieravyšaje. I kali paśla hetaha karyść hetkaja zaraz-ža nie dastaŭlajecca, tady... biada, tady „kooperacyja ničoha nia varta", tady „kooperatary heta ašukancy".

Ci-ž heta tak?

Nie, dvojčy nie! I heta z nastupnych pryčyn:

Kooperacyja jość tavarystvam, suviaźziu ludziej dabravolnych, jakija musiać pradusim viedać, što: 1. kali niečaha ad kooperacyi žadać, to treba viedać — što i pry jakich umovach jana moža dać i 2. „nie tady sabak karmić, jak iści na palavańnie". Najlepšaje siaŭbovaje ziernie, pasiejenaje ŭ kamianistuju ci zamokšuju hlebu, abo rasovaja skacina zapiortaja na našy dzikija paśbišču pryniasie nie karyść ale peŭnuju stratu — prapadzie. I ci-ž chto, pry zdarovym rozumie budučy, budzie ŭ hetym vypadku vinavacić u stracie henu adbornuju siaŭbu, ci rasovuju skacinu? Chiba-ž nie, bo vinavat tut sam toj haspadar, što staviŭ tolki vymahańni, a sam nie pakłapaciŭsia, ci nia moh adpaviedna vybrać, vyrabić i vyhnaić pola, padšukać adpaviednaj pašy, biez jakich vykarystańnie jak siaŭby, tak i rasovaj skaciny prosta niemahčymaje.Taksama i z kooperacyjaj: i jana dašć karyść, ale tady tolki, kali trapić na vyrablenuju hlebu ludzkich duš, kali ludzi, što kala jaje hurtujucca, *družna, z vieraj i rašuča* da namiečanaj mety jduć. Heta raz. A druhoje — kooperacyja nia jość ani dabradziejnaściu, ani tymbolš daraznaj pomaččų, što dzieić voś-voś, byccam pryłožanaja čaradziejskaja rozačka. I tut voś mieścicca najbolšy badaj sakret samoj kooperacyi, a razam i pamyłka tych, chto hetu kooperacyju razumieje byccam niejkuju lekarskuju kliniku, ci susim „skoruju pomač", kudy čałaviek idzie tady, kali jon chvory i spadziajecca tam pomačy, lekaŭ zaraz ža, „na pačakańni". Voś ža chto-b hetak razumieŭ kooperacyju, toj jaje susim nie razumieŭ-by. I heta z taje prostaje choć by pryčyny, što kooperacyja hurtuje ludziej nie ad vypadku da vypadku, a znača samych tolki chvorych, ci kalek, ale ŭsich i stała. Tamu inšymi jana kirujecca i zakonami, najvažniejšym z katorych jość toj, što čałaviek musić iści ŭ kooperatyvu pamahčymaści pokul jašče zdarovy, jak zdarorovym naprykład idzie čałaviek strachavacca ad niaščaścia.

Tolki tady, kali ludzi navučacca hladzieć upierad vačmi svajho rozumu, svaje dušy, kali zrazumiejuć, što darma i z ničoha ništo nia rodzicca, a vyrastaje pavoli z drobnaha, ale zdarovaha ziarniaci, što najbolšyja budynki składajucca z tysiačaŭ i tysiačaŭ ciarpliva i pracoŭna złožanych cahlinak, tady tolki možnu budzie rachavać na pravilny rost kooperatyvaŭ. Tymčasam-ža treba ŭparta, u doždž i ŭ niepahodu pachać zadzirvaniełaje pole ducha, u maroz i śpiakotu znasić cehłu — źbirać i pierakonyvać ludziej što nikomu nie patrebna ichnaje hora i biada, ale nichto i nie zabaviazany tvaryć im dabrabytu, što kožny kaval svajho ščaścia, što niama rečaŭ nieasiahalnych, niemahčymych, choć kožny pačatak ciažki. Ništo adrazu vialikim nie pačynałasia, ale vyrastała z pracy i ciarplivaści i takija tolki rečy majuć tryvałkuju vartaść.

Ziernie kooperatyŭnaje maje ŭsie zadatki uradzić płod zdarovy i vialiki. Treba tolki jaho ciarpliva dahladać, niaŭdačami nie adstrašyvacca, bo „i Vilniu nie za raz zbudavali".

# Adhałosak „Dnia Kooperacyi“.

Mižnarodny Kooperatyŭny Sajuz, apračа svajej adozvy, jakaja była źmieščana ŭ apošnim numary (5—6) „Samapomačy“, vydanaj z pryčyny „Dnia Kooperacyi“, vydaŭ jašče prajekt rezalucyi, jakuju prapanavaŭ dla ŭsich nacyjanalnych Sajuzaŭ kooperacyi. U hetym prajekcie rezalucyi miž inšym havorycca:

*„My vitajem ščyra i pabracku ŭsich kooperataraŭ śvietu, jakija siaħońnia, adušaŭlonyja supolnym ideałam, pad viasiołkavym (radužnym) siamikalornym ściaħam prapaviedvajuć pieramoħu kooperatyŭnaj dumki i postup cyvilizacyi;*

*My jšče raz dajom vyraz našaj ćviordaj rašučaści, z jakoj budziem adstajvać dabravolny i niezaležny charaktar kooperatyŭnaha ruchu, dzie heta ni było-b, dy barocca za absolutnuju jahonuju svabodu ŭ pracy i samaŭpravie;*

*Vykazvajem svaju vieru, što systema haspadarčaha supracoŭnictva, jakuju my pravodzim, heta adziny realny šlach da padarvańnia ŭva ŭsim śviecie pryvatnych pradpryjemstvaŭ, što pracujuć dla zysku;*

*My bačym u budučyni pieramoħu sarhanizavanych spažyŭcoŭ nad biazlikimi praciŭnikami...;*

*Žaklikajem kooperataraŭ usiaho śvietu abjadnacca ŭ solidarnaj, silnaj i ahulnaj manifestacyi na karyść miru, svabody i spraviadlivaści, jak adzina—zdarovych padvalin dzieła razbudovy praŭdzivaj cyvilizacyi“.*

Ukrainskaja kooperatyŭnaja presa („Кооперативна Республика“ № 7—8) źmiaščajučy hety hołas Mižn. Koop. Sajuzu, dadaje da jaho dźvie svaje papraŭki:

*„Pieršaje: Kooperacyja hurtuje i abaraniaje nia tolki spažyŭcoŭ, ale i milijony pracoŭnych vytvorcaŭ, abaraniajučy ichnyja pracoŭnyja zarabotki, a nie kapitalistyčnyja zyski. Ci doŭha jšče budzie ŭ Mižnar. Koop. Śviecie pakutavać adnastarońniaje spažyvieckaje nastaŭleńnie?*

*„Druhoje: Kooperataram niedziaržaŭnych nacyjanalnaściaŭ niezačym stanavicca apostałami miru za ŭsiakuju canu. Bo mir — aznačaje stabilizacyju nie adnaje kryŭdy, kali hetyja kryŭdy nia buduć napraŭleny mirnym šlacham“.*

Sapraŭdy tak!

*Red.*

*Ci Vy što robiecie dla haspadarčaha adradžeńnia biełaruskaha narodu?*

*Čytajcie, pašyrajcie adzinuju biełaruskuju kooperatyŭna-haspadarčuju časopiś „Samapomač“ i źbirajcie na jaje padpisku!*

# Коопэрацыя здароўя.

Здароўе для чалавека гэта скарб ягонага жыцьця. Прызнае гэта бадай кожны і як-жа аднак супярэчна з гэтым жыцьцёвая рэчаістасьць! Бо гдзе-ж болей правіненьняў, як прад элемэнтарнымі вымогамі гыгіены, якая вучыць, як жыць, каб быць здаровым?! Поўна гэтых правіненьняў як на „вярхох,“ дзе ўсё-ж ёсьць сякая-такая магчымасьць карыстаць з здабычаў мэдычных навук; яшчэ больш гэтых правіненьняў на „нізох“, у гушчах работніцкіх і тымбольш — сялянскіх, для каторых усякая помач, а нават рада недаступна сяньня проста дзеля таго, што яна зьвязана з грашовымі выдаткамі. А дзе-ж грошы ў гэтай бядоты? Пры месцы і з вялікім націскам зазначыць трэба, як не апраўдалі надзеяў г. зв. «Касы Хворых», у каторыя прымусова пазаганяна работніцтва большасьці сучасных дзяржаў: і дорага яны абходзяцца і найчасьцей марна лечаць; пацьвердзіць гэта не адзін „ашчасьліўлены.“ Доказ гэта, што прымусам і сілай таго не дакажаш, што патрапіць сьвядомая воля агулу, грамады.

Коопэрацыя, што ўжо ахапіла сабой гандаль, крэдыт, рознаякую вытворчасьць, не астанавілася і прад забясьпячэньнем сваім сябрам таннай, скорай і дакладнай лекарскай апекі. Узьнікла такім чынам сумысная коопэрацыя, коопэрацыя здароўя. Бацькаўшчынай гэтага віду коопэрацыі зьяўляецца Югаславія і туды сяньня зьяжджаюцца людзі з усіх старон, каб на месцы новую праяву жыцьця пазнаць, ацаніць. Мы пазволім тут сабе скарыстаць—мясцамі дaслоўна — з апісаньня гэткай коопэратывы польскага журналіста К. Вышамірскага у „Czasop. Spółdz. Roln.“ К. В-скі піша:

„..Югаслаўская дзяржава зварочвае вялікую ўвагу на здароўе вёскі. Але найлепшая нават праграма дзяржавы ня можа быць хутка зьдзейсьненай, хоць-бы дзеля нястачы грашэй. І тут вось зьяўляецца сэрбскі селянін, уроджаны коопэратар. Ня хоча чакаць, покуль прыйдзе да яго казна даваць некаторую помач, стаўляць „Дамы Здароўя“ і г. д. Мусіў-бы доўга на гэта чакаць, а тымчасам цэлыя соткі вёсак аставаліся-б бяз лекараў, бяз лазьняў, вёска была-б пакінена на ласку і няласку прыватных лекараў і аптэк. Ня мог з гэтым пагадзіцца сялянскі сын Д-р Гаўрыла Койіч. Ён першы ў Сэрбіі*) бун-

*) Сэрбія — гэта адна з трох складовых сучастак сучхснай Югаславіі, у каторую, акрамя Сэрбіі, ўваходзяць яшчэ Харвацыя і Славэнія.—рэд. „С—чы.“

## Z presy.

### „Miadźviedžaja prysłuha".

Pryniać treba za ahulnaviedamaje, što takoje jość „miadźviedžaja prysłuha". Voś-ža hetkuju „prysłuhu" dla kooperacyi zrabiła anahdaj z pryčyny „Dnia Kooperacyi" „Беларуская Газэта" (№ 3), unosiačy ŭ adziny moža siahońnia akord biełaruskaj publičnaj dumku, jaki da apošniaha času zyčeŭ poŭnym suhałośsiem, ton čužy, falšyvy. „Бел. Газэта" zrabiła pieršuju sprobu „ŭsadzić śpicu ŭ kałaśnicu" — pafarbavać ciažka zmontavanyja pačatki sroha apolityčnaj kooperatyŭnaj pracy ŭ koler palityčny i hetym samym rassadzić usiu spravu na miescy. Nia viedajem dahetul, ci heta stałasia praz niedahlad, ci z jakoj inšaj pryčyny i dziela taho tymčasam strymoŭvujemsia ad zaniaćcia stanovišča suproć hetaha jak-ni-jak vielmi sumnaha javišča. — Śćvierdzić tolki jašče raz musim, što dahetulašniaja naša linija była sroha apolityčnaj i takoj za ŭsiakuju canu astaniecca. Chto-ž-by pavažyŭsia hetu apolityčnaść raźbivać, toj chaj maje advahu pryniać na siabie za heta i adkaznaść.

*K—r.*

*Niavyrazna pisanyja piśmy redakcyja „Samapomačy" vykarystyvać nia moža. Pišecie vyrazna!*

## Paśla Konferencyi.

Končyłasia anahdaj (28 lipnia s. h.), a ŭłaściva „na niejki čas" uhrazła ŭ ślapoj vulicy Suśvietnaja haspadarčaja konferencyja ŭ Londanie, jakaja tryvała tam ad 12 červienia i ŭ jakoj brała ŭčaście kala 2.000 (dźviuch tysiač) delehataŭ ad 66-cioch dziaržavaŭ. Nia treba dadavać, što kaštavała heta konferencyja hrubyja hrošy i ni da čoha nie pryviała. Najcikaviej adnak toje, što ŭ udaču hetaj konferencyi nichto amal nia vieryŭ,i adnak ŭsie tam siadzieli dy pieralivali z pustoha ŭ parožnaje. Tak ŭžo na śviecie viadziecca.

Na paradku dnia niedakončanaj konferencyi stajali try hałoŭnyja pytańni: stabilizacyja valut, padvyžka cenaŭ na pradukty i skasavańnie, abo abnižeńnie cła. — Pytańnie stabilizacyi valut było pieršym: na jaho natknułasia konferencyja i ab jaho raźbiłasia. Pačatki hetaha pytańnia siahajuć sasoŭ i pryčyn raniejšych. Hod z lišnim tamu nazad Anhlija abnižyła vartaść svaich hrašej, chočačy hetym uzmacnić svoj vyvaz i hetym samym dać pracu svaim-ža rabotnikam.

Z hetaha kroku anhielcy byli zdavoleny. Śladziŭ ich adnak zavidnym vokam amerykaniec Roosevelt i jak tolki dajšoŭ da prezydenskaj ułady (4.III.1933 h.), dyk zrabiŭ toje samaje. Heta znača jon, majučy poŭnaje pakryćcio papiarovych svaich hrašej (dolaraŭ) u załacie, ichnuju vartaść u paraŭnańni da załata abnižyŭ blizu na adnu tracinu: naprykład, kali

---

туецца проціў спэкулянства лекарскіх аплатаў, а таксама проціў таго, што лекары хочаць быць толькі ў местах, а 80% жыхарства, г. зн. сяляне, ня маюць магчымасьці карыстацца з хуткай лекарскай помачы. Д-р Койіч кінуў кліч: **Самі сяляне мусяць узяць справы здароўя свайго ў свае рукі.** У 1921 годзе сарганізаваў ён першую „Коопэратыву здароўя." Сягоньня гэтых коопэратываў у Сэрбіі ёсьць ужо 83.

„Коопэратывы гэтыя маюць даць сваім сябрам лекарскую помач, процідзеяць хваробам, а таксама пашыраць на вёсцы гыгіену і асьвету. Сябры ўносяць паі, а таксама плацяць месячныя складкі... Управа коопэратывы наймае лекараў, упраўляе маемасьцю і мае кантроль над цэласьцю прац."

Далей К. В—скі апісвае дзьве такія коопэратывы.

Коопэратыва здароўя ў сяле Баняны існуе ўжо ад 1925 г. Спачатку належыла да яе 178 сяброў, сягоньня яна налічвае 404 сяброў. На аднаго сябру трэба ў сярэднім лічыць 6 асоб (сям'і). Коопэратыва абслугоўвае тады ў сярэднім ў 6 разоў больш асоб, чым мае сяброў...

„Апісваная коопэратыва утрымоўвуе аднаго лекара і лекарку, каторыя атрымоўвуюць сталую пэнсію і абавязаны даваць лекарскія рады кожнаму, хто іх будзе жадаць. Сябры коопэратывы плацяць за параду па 10 дінараў (1 зл. 20 гр.); іншыя (нясябры) плацяць па 40 дінараў. Аплаты ад сяброў цалком ідуць у касу Коопэратывы, а ад нясябраў — палова для Коопэратывы, а палова для лекара. Лекары раз у месяц бясплатна аглядаюць усіх школьных дзяцей з тых вёсак, з каторых бацькі належаць да Коопэратывы Здароўя. Па пераглядзе дзяцей лекары радзяць бацьком як жывіць і лячыць дзяцей. Раз у год лекары абавязкава абходзяць усіх жыхараў свайго вокругу і на гэтай аснове робяць апісаньне памешканевых і здароўных варункаў кожнага сябры Коопэратывы. Знача, калі хворы прыйдзе да лекара, дык гэты ўжо знае варункі ягонага жыцьця: якую мае ваду да піцьця, якія вокны, колькі спальных ложак і г. д. Паза лякарствам дае лекар раду як папravіць недастаткі ў хаце, ці на панадворку, каторыя ад'емна ўплываюць на здароў'е жыхараў. Акрамя таго лекары раз у тыдзень вядуць перагляд цяжарных кабет, а таксама дзяцей да 1 году.

„Коопэратыва гэта выбудавала прыгожы коопэратыўны дом, у каторым ёсьць заля для лекарскіх прыняцьцяў, 2 пакоі для хво-

za 1 dolar pierš płacili 8 zł. i 90 hr., to 31.VII. s. h. płacili ŭžo tolki 6 zł. 54 hr. A byŭ čas, što płacili ŭžo tolki 5 zł. 80 hr.

Jak budzie dalej — nichto nia viedaje. Hetkaja niapeŭnaść, reč jasnaja, vielmi dakučaje tym, chto z dolaram tak ci hetak źviazany. A chto-ž siańnia z im nie źviazany? I dziela taho šmat chto jechaŭ u Londan na konferencyju z nadziejaj, što ŭdasca supolna adhavaryć Amerykancaŭ ad hetkaha abnižańnia vartaści dolara i zabiaśpiečyć takim čynam „valutovy mir“. Adnak ašukalisia, bo ŭžo 3 lipnia prezydent Roosevelt zajaviŭ, što jamu — dobra i tak, a pa druhich hałava jamu nie balić. Heta zajava ŭžo faktyčna rašyła ab losie konferencyi, jakaja padzialiłasia na dva fronty: za Amerykaj, a znača za zvabodaj abnižańnia hrašej u paraŭnańni z ichnaj vartaściu da zołata vykazałasia Anhlija, a suproć im staŭ front dziaržavaŭ, jakija parašyli prytrymoŭvacca za ŭsiakuju canu vartaści zołata; na čale hetaha frontu stała Francyja, siudy-ž dałučyłasia i Polšč. Z hetym konferencyja raźjechałasia: ci, dzie i kali źjedziecca jana ŭznoŭ — trudna siahońnia adhadać. Trudna taksama adhadać u katory bok pakociacca dalšyja padziei: ci „załaty“ blok sapraŭdy ŭtrymaje svaju valutu ad patanieńnia (devaluacyi), ci nadvyška pataniеŭšych amerykanskich dolaraŭ i anhielskich funtaŭ*) na ŭsich rynkach budzie tak vialikaja, što paciahnie za saboj udoł i hrošy tych dziaržaŭ, što ich siańnia dabravolna abnižać u vartaści jšče nia chočuć. Peŭnaj zatoje jość rożnica pamiž apuskańniem vartaści hrašej tych dziaržaŭ, katoryja — jak Ameryka — u kožny mament mohuć hetym hrašam viarnuć ichnuju załatuju vartaść, bo majuć dla hetych hrašej załatoje pakryćcio, — a apuskańniem vartaści tych hrašej, dziaržavy katorych hetkaha załatoha pakryćcia nia majuć: u hetym apošnim vypadku raz kranutaja z miesca vartaść hrašej moža skacicca ŭ propaść, ciahnučy za saboj ślozy i praklon česnych aščadnikaŭ.

Hetak spravy siańnia stajać. Devaluacyja nam u Polšču tymčasam biespasiaredna jašče nie pahražaje. Varta adnak zahlanuć u vočy hetaj mahčymaści bližej. — Cikava nasampierad adciemić, što za devaluacyju chapajucca siańnia tyja dziaržavy (nia ŭsie!), hrošy katorych nie skałychnulisia ŭ svajej vartaści padčas i paśla vajny. Tyja-ž uznoŭ dziaržavy, jakija heta „dabradziejstva“ pieražyli, stajać siahońnia prociŭ jaho. Dapuścim na chvilu adnak, što chvala abiascenivańnia (devaluacyi) zaharnuła i Polšč. Što atrymoŭvujecca?

Pieršaje — moža i najvažniejšaje — niama tut tej peŭnaści, jakaja-b pazvalała — jak Amerycy — abiascenivańnie daviaści da peŭnaj hranicy i na joj zatrymacca, bo... niacikava staić sprava z pakryćciom zołata. A dalej? Tyja, chto panabirali pazyčki, ciešać siabie nadziejaj, što pry devaluacyi zmahli-b ich lohka spłacić. Ryzykoŭnaja heta „zdabyča“, nie ha-

*) hetak nazyvajucca anhielskija hrošy.

рых, 1 пакой для палажніц..., заля адчытовая, пакой на бібліятэку і чытальню, прышніц, дзе раз у тыдзень бясплатна мыюцца ўсе школьныя дзеці, ёсьць так-жа спэцыяльная кухня, заля для кухарскіх курсаў, памешканьні для лекараў і аптэка“...

Сяляне адзываюцца аб сваей коопэратыве здароўя гэтак: „Наша Коопэратыва, гэта наша наймілейшае дзіця. Мы тут усё самі рабілі: вазілі пясок, цэглу, бялілі і г. д. А лекары нашы гэта „анелы-храніцелі!“ Яны не зацікаўлены ў тым, каб нас якнайбольш хварэла... У Коопэратыўным Доме ў Банянах ёсьць свая аптэка, у каторай сябры дастаюць лякарства на 30% таней...

„...Коопэратыва Здароўя ўжо даволі шырака і глыбака закаранілася ў душы вёскі. Вядзецца проці іх аднак і барацьба. Вайна йдзе на два фронты: з боку лекараў і з боку прыватных аптэкаў. Лекарская Палата на адным з сваіх паседжаньняў вынесла нават рэзалюцыю, што кожнага лекара, які згодзіцца вясьці ахвярную працу ў сялянскіх коопэратывах, выкіне з саюзу. Аптэкары, каторыя зараблялі вагромністыя, нікім некантраляваныя сумы, палажылі шмат грошай на вайну з аптэкамі коопэратыўнымі... Аднак сялянскія коопэратыўныя лекары, гарачыя патрыёты і праўдзівыя місіянэры паднясьцьця стану здароўя вёскі, а таксама сяляне—коопэратары не пераставалі працаваць і сягоньня маюць ужо сваю цэнтральную аптэку, а па вёсках паасобныя коопэратывы маюць 53 аптэкі; ёсьць надзея, што ў хуткім часе ўсе коопэратывы будуць мець свае аптэкі.

„Урэшце — піша К. В—скі—мушу сказаць, што так харошай працы, так ідэальных лекараў і так дабраных коопэратараў не спатыкаў я ані ў Даніі, ані ў Чэхаславаччыне, ані ў Польшчы. Югаславія у гэтай працы ёсьць узорам для цэлай Эўропы.“

Харошае гэта і сапраўды завіднае пасьведчаньне для находчывасьці і працы нашых паўдзённых братоў — югаслявян. Варта, каб гэтым сьветлым прыкладам зацікавіліся і беларускія як лекары, так коопэратары і ўсё грамадзянства, бо і наша беларуская вёска вельмі патрабуе лекарскай апекі. Даць-жа нам гэтага ніхто ня дасьць — добра будзе, каб толькі ня было перашкод ў гэтак сьветлай справе самапомачы.

Д-р Б. Ш.

voračy ŭžo susim tut ab nieetyčnaści bahačeńnia čužoju majemaściu. Ale dapuścim, što i heta stałasia i daŭhi paspłačyvany: što dalej? A voś: spačatku, praŭda, padymiecca cana na pradukty — ziemlarobskija i pramysłovyja, — ale paśla nastanie ŭznoŭ niedachop hraša, jakoha nieadkul budzie dastać na spłatu navat źmienšanych zabaviazańniaŭ (daŭhoŭ) i tady moža nastać apošni ŭdar — kaniešnaść pradažy apošniaha, pradažy ziamli. Što heta moža być, ab hetym śviedčyć niadaŭniaja pavajennaja sapraŭdnaść: vioska paspłačyvała pa vajnie daŭhi ŭ zdevaluavanaj (abiascenienaj) valucie i, vykarystaŭšy paru mahčymych hadoŭ, uznoŭ tak zadoŭžyłasia, što siahońnia nia ŭ siłach spłačyvać nia tolki pazyčanaj sumy, ale navat umoŭlenych pracentaŭ. I hetyja voś daŭžniki siańnia ŭznoŭ čakajuć — i z hetym nia skryvajucca — na abiascenivańnie hrašej. Ci hetaha dačakajucca, — nia viedama. Viedama tolki, što hetkim daŭžnikom bolš nichto hrašej pažyčać nie zachoča, a ŭsiu volnuju ci ŭžo pad załoh ziamli pazyčanuju hatoŭku vykarystaje na vykup hetaje-ž ziamli. Hetak ziamla stanie pierachadzić z ruk sialanstva ŭ ruki spekulantaŭ.

A pamahła-b im da hetaha devaluacyja hrašej. — Vidać z hetaha, što karyści z devaluacyi nadta ryzykoŭnyja, a niebiaśpieka dla našaha sialanstva prosta hroznaja. Bo niama chiba dla jaho ničoha horšaha, jak dumka vyzbycca za daŭhi rodnaha kuta, rodnaha pola. Vialikaja tut strata była-b pryvatna-haspadarčaja i nieabličalnaja — narodnaja, bo što-ž stałasia-b z narodam, kali los vykinie jaho z rodnaha zahonu?

— *ver.*

# Pierad pačatkam školnaha hodu.

Novy školny hod sioleta pačynajecca raniej pary dahetul pryniataj za zvyčajnuju. Čaho nam možna i čaho treba ad hetaha hodu spadziavacca?

Minajem tut zrazumiełyja balački nacyjanalnyja, što školnictva na biełaruskich ziemlach i dla našych-ža biełaruskich dziaciej jošć dla ich čužym, niebiełaruskim. Pryznajom całkom, što tut, pamima i suproć našaj voli, suproć najistotniejšych intaresaŭ našaha narodu i ŭ razrez z elementarnymi praviłami i pahladami navukovych dośledaŭ, nam dzieicca ciažkaja, čornaja kryŭda. Dachadzić hetaj kryŭdy adnak my tut nia budziem, bo jošć ad hetaha inšyja našy nacyjanalnyja arhanizacyi i jany heta jak mohuć robiać. — Dla nas tut važna školnaje pytańnie z druhoha boku: my tut chočam kinuć mały choć-by pramień śviatła na školu naahuł, jak na miejsca i sposab pryhatavańnia da žyćcia.

Školnaja ankieta, jakuju ciapier jak-raz ładziać adpaviednyja biełaruskija ŭstanovy, vykazała miž inšym, što nasielnictva, ŭ masie svajej, dahetul hladzić jašče na školu, navat pačatkavuju — jak na miejsca pryhatavańnia dzietvary da čynoŭničaha chleba(!). A što horš— nie adzin kaža, što „naahuł škoła ziemlarobu niepatrebnaja".

Voś tyja dva — na siahońnia — parohi, praz jakija treba pierastupić. Lahčej moža dakazać niedarečnaść „parohu" apošniaha, bo ćvierdzić siańnia, što ziemlarobu niepatrebna škoła, moža sapraŭdy tolki całaviek ahraničany. To-ž i sučasnaja niepapłatnaść ziemlarobstva, ci jak kažuć „haspadarki" ŭ tym najbolš i maje svaju vinu, što jano dahetul stanoŭča zamała z škoły karystała. Hetym nia skazana jšče, što vina tut samoha tolki sialanstva, bo škoła nia ŭsiudy była jamu — jak i nia jość!— dastupnaj. Ale siahońnia jasna nad usio ŭ śviecie, što ciomnamu biazhramatnamu całavieku žyviecca što-raz ciažej i što biassumniŭna nabližajecca mament, kali samavolna ciomny całaviek budzie ŭ žyćciovych rachunkach mienš vart ad pieršaj z kanca štuki žyvioliny. Dyk treba abo vučycca, abo raŭniacca z niemaj žyviołaj i biez narakańniaŭ na kaho-niebudź znasić svoj horki los!

Trudniejšym moža, ale ŭ kancy nia mienš jasnym pytańniem jość i druhoje: „kudy kiravać „vyvučanuju" moładź?"

Ciažkaja i niaŭdziačnaja praca sielanina-ziemlaroba padskazvaje jamu, što „ničoha musić horšaha ad ziemlarobstva niama" i tamu bačyć jon ideał u zasochłym (choć časam i puzatym) čynoŭniku; a kali dzicia paznaje „pa biełym čornaje", dyk preč jaho abaviazkava „u ludzi", u „pisary" ci kaho tam inšaha. Ci-ž tak musić być sapraŭdy? Nie! I heta tamu, što ziemlarobstva ničuć nia horšaje ad jakich inšych zaniaćciaŭ. To-ž ideałam, dumkaj, mryjaj--pažadańniem kožnaha choć-by čynoŭnika jość mieć svoj kusok ziamli i svaju chatku. A dalej, ziemlarobstva samo tady budzie tolki apłačyvacca, kali im kiravać buduć ludzi nia ciomnyja, a dobra navukaj praśviečanyja, abo prynamsia tyja, što da hetkaj navuki hornucca. I fabryka siahońnia nijakaha dachodu nie davała-b, kali-b u joj pracavali ludzi tak, jak pracavali tam dziady-pradziedy, h. zn. sto hadoŭ tamu nazad. A što-ž lahčej spatkać u haspadarcy, jak narakańnie, što „baćki-dziady našy tak haspadaryli i my tak pražyviom". Pražyviom? Nie! Nie pražyviom, bo nas zadušyć — i ŭžo dušyć! — usiaki promysł i handal, jaki tak nia žyvie, jak žyli baćki-dziady. Znača, kali choča sielanin-ziemlarob žyć i žyć paludzku, musić paludzku, h. zn. pasiahońniašniamu dumać i pastupać.

A dziela hetaha pieršym varunkam jošć nie pasyłać „u śviet", „u čynoŭniki" ci „užendniki" svaich synoŭ-dačok, jakija siak-tak navučylisia čytać-pisać-rachavać, a zatrymać ich za ŭsiakuju canu na vioscy, na ziamli: jany musiać być nia samymi śvietačami, ale tymi skromnymi ščelinami, praz katoryja pranikacimie nanašu ziemlarobskuju viosku śviatło praŭdy, na-

vuki, postupu, dabrabytu. Hetkija „ščeliny“ śviatła miecimuć vialikaje zaačeńnie, ale jany najvyšej zdolny prabudzić tych, što śniać ab „viernaści dziadom“.—Kab-ža vioscy našaj ziemlarobskaj zapeŭnić tryvały postup, treba na miescy mieć samyja vohniščy, što nia tolki śviacili-b, ale i sahravali-b, nadzialali-b enerhijaj. Hetymi vohniščami musiać być arhanizacyi: hurtki arhanizacyjaŭ kulturna-aśvietnych, fachova-ziemlarobskich, kooperatyŭna-haspadarčych. Pry hetkich vohniščach patrebny tyja, chto-b hetaha ahnia pilnavali, jaho dahladali: na heta patrebny ludzi, jakija-b prajšli adpaviednyja školy, kursy ci choć-by da hetaha kiravalisia šlacham samaadukacyi. Jość pa našych siołach i miastečkach šmat ludziej z ahulnaj aśvietaj i ŭmiełaściu čytańnia-pisańnia. Ichnaja była-b zadača da hetkaj konkretnaj mety jšci šlacham samaadukacyi. A tuju moładź, što pakidaje siańnia školy ahulna-aśvietnyja, pačatkavyja ci siarednija, treba abaviazkava — ale nia siłkom! — kiravać u školy s p e c y j a l n y j a, fachovyja. Pomnić treba, što siańnia aśvieta ahulnaja, nie specyjalnaja (nie fachovaja) tak mała daje, jak i ničoha.

Dosyć pradukavać intelihientnych spažyvačoŭ (konsumentaŭ), treba pradukavać intelihientnych vytvorcaŭ (pradiucentaŭ)! Heta pavinna być ideałam, jaki ŭ žyćcio možna budzie pravodzić tolki pamału. Adpaviednych škoł na heta siańnia dosyć niama, bo kazionny kirunak palityki školnaj zaniaty pryhataŭlańniem sabie tolki čynoŭnikaŭ, a nie samadziejnych pracaŭnikoŭ. Hetu niastaču tymčasam možna zapoŭnić tolki samaaśvietaj, aśvietaj pazaškolnaj.

Słovam, kudy nia kiń, na vioscy ŭsiudy i ŭsiudy adčuvajecca niastača ludziej śvietłych i ich treba z vioski nie „vyžyvać“ u „čynoŭniki“, ale ŭsimi siłami z vioskaj źviazyvać. Kab-ža heta intelihiencyja viaskovaja dy mahła praduktyŭna dla vioski pracavać, musić davučyvacca šlachami školnaj i pazaškolnaj aśviety ŭ fachovych haspadarčych kirunkach (u škołach, na kursach i inš.). Hetkaja intelihiencyja na siale našym nikoli nia budzie biezrabotnaj. Budzie heta karysnym i dla vioski.

*A. K.*

AD REDAKCYI: U źviazku z vyšejapisanaj patrebaj i prosta kanieśnaściu specyjalizavańnia pracaŭnikoŭ na viosku, redakcyja „Samapomačy“ służyć achvotna i biaspłatna infarmacyjami, hdzie i jakuju fachovuju aśvietu možna dastać. U piśmie z zapytańniem pavinny być miž inšymi takija danyja: 1. Imia proźvišča i adres (vioska, poštal), 2. jkali radziŭsia(łasia), 3. jakuju školu skončyŭ(ła), 4. čaho choča vučycca i ci ŭ vybranym fachu ŭžo dzie i jak doŭha pracavaŭ, 5. stan zdaroŭja, 6. stan materyjalny. 7. Jakija znaje movy. — Na adkaz dałučyć treba da piśma paštovuju marku za 30 hrašoŭ. — Piśmy adresavać na adres: Redakcyja „Samapomačy“, Wilno, ul. Połocka 4—10.

## Kooperatyŭnyja naviny.

M i ž n a r o d n a j a k o o p e r a t y ŭ n a j a k o n f e r e n c y j a ŭ B a z e l i adbyłasia 9 i 10 červienia. U rezalucyi pryniataj konferencyjaj pieršy raz ad času zasnavańnia Mižn. Koop. Sajuzu pryniaty pad uvahu i damahańni sielska-haspadarčaj kooperacyi, pobač z damahańniami kooperacyi spažyvieckaj.

5 0 - y j a ŭ h o d k i ś m i e r c i H. S c h u l z e - D e l i t z s c h, niemca, zakładčyka pieršych kredytovych kooperatyvaŭ typu haradzkoha. vypadajuć sioleta. H. Sch.-D. jość apračа taho faktyčnym aŭtoram pieršaha kooperatyŭnaha zakonu ŭ Prusii z dnia 27 sakavika 1867 h. Radziŭsia H. Sch.-D. 29.VIII.1808 h. a pamior 29.IV 1883 h.

Ź m i e n a k o o p e r a t y ŭ n a h a z a k o n u ŭ P o l š č y ŭsiož-dyki maje nastupić. Jak padavali hazety, prajekt hetaj źmieny ŭžo blizu što hatoŭ. Dakančyvajecca tolki jšče apracavańnie taho miesca zakonu, dzie jon pastanaŭlaje ab kooperatyvach budaŭlanych i pamieškaniovych. — Celaść zakonu, jak viedama, ahraničvaje samadziejnaść kooperacyi i ŭzmacniaje nadzor nad joju ŭladaŭ ahulnaj administracyi (palicyi). Nie biez značeńnia jość i praviedzienaja anahdaj źmiena na stanoviščy staršyni — jon n a z n a č a j e c c a ministram finansaŭ — Kooperatyŭnaj Rady.

# Сельская гаспадарка.

## Як вывесьці мшыцу.

Мшыца гэта вельмі малая мушка, што размнажаючыся нязвычайна скора можа зьнішчыць соткі і тысячы садовых дрэваў і кустоў. Сёлета як-раз з усіх бакоў нашага краю надыходзяць весткі, што мшыца сапраўды ўжо панішчыла ўраджай у садох ды што пагражае гэтыя сады зьнішчыць дашчэнту. Дзеля гэтага разгледзім тут пару спосабаў, як трэба супроць мшыцы змагацца.

Найбольш пашыраным спосабам забіваньня мшыцаў ёсьць апырсківаньне напаздзенага дрэва табачным адварам. Гэты адвар прыгатаўляецца гэтак: 400 грамаў (фунт) найгоршай табак (махоркі, або табачнага пылу) гатуецца праз 6—8 гадзін у 12 літрах*) вады. Гэткую вараніну цэдзяць праз чыстую парцянку, дадаюць яшчэ 24 літры (два вядры) вады і 125 грам шэрага мыла распушчанага прад тым у крысе гарачай вады. Прыгатаваным гэтак адварам спырсківаюцца тыя мясцы на дрэвах, дзе сядзяць мшыцы.

У шмат выпадках нішчаць мшыцаў у фруктовых садох і на варыве таксама пры помачы распушчанага ў цёплай вадзе самога тольк мыла: 400 грам (фунт) шэрага мыла на 12 літраў вады. — Нішчыць трэба мшыц не чакаючы, зразу як толькі яны паявяцца. Само скрапліваньне трэба паўтарыць са тры разы, у 2 тыднёвым одступе часу.

*) 12 літраў гэта вядро.

Да гэтай-жа мэты ўжываецца йшчэ і мыдляна-нафтовая мешаніна, якая прыгатаўляецца гэтак: У 3-ох літрах гарачай вады распускаецца 100 грам мыла, стала перамешваючы шчоткай ці якім вехцем. Пасьля даліваецца па частках 600 грам нафты (карасіны), мяшаючы найменш кожныя 15 мінут. Да гэтай мешаніны, падобнай да рэдкай сьмятаны, даліваецца йшчэ 3 літры гарачай вады і 12 літраў (вядро) сьцюдзёнай. Гэтак пры гатаванай мешанінай можна таксама пакрапляць дрэвы супроць мшыцаў. Трэба памятаць толькі на дзьве рэчы: 1. скрапляньне мыдляна-нафтовай мешанінай можна рабіць толькі пры нявысокай тэмпэратуры паветра, 2. сама мешаніна мусіць быць сьвежай (не старэйшай аднэй гадзіны часу) і стала мяшанай, каб не аддзялілася нафта, каторая магла-б папарыць усё дрэва.

*інж. Д С.*

## За сярпом плуг.

Так ужо вядзецца ў нас, што чуць толькі зьбярэцца ў жменькі бедны ўраджай вуз кіх шнюроў, як яны перамяняюцца ў „пасьбішча" для згаладаўшай да поўсьмерці скаціны і інш. свойскай жывёлы. Кепска гэта, але да гэтага змушае нястача сапраўднага пасьбішча. І што-ж атрымоўуецца? За пару дзён і гэта аржышча перамяняецца ў „пустыню", на якой пачынае ўзноў усходзіць усякае выцерушанае пустазельле. І гэтак марнуецца поле да восені, — а ня раз астаецца незааранын і на зіму.

Інакш радзяць сабе ў нястачы пашы гаспадары краёў з высокай, як кажуць, земляробскай культурай. Там яны не пазваляюць вольнаму аржышчу стаяць і аднаго дня: снапы зараз-жа састаўляюцца ў копкі, а аржышча м е л к а заворываецца. Узаранае гэтак аржышча або зараз-жа — прыбаранаванае — абсейваецца якойсь пашнай расьцінай, або стаіць „на чорна" да вострай зімавой воркі: у першым выпадку яно дае пашу ці зялёнае гнаеньне, у другім — поле „адпачывае" і набірае сіл да вясьняных засеваў. У абодвух выпадках прарасшае ў аржышчы пустазельле мелкай воркай заворываецца і гіне. Да ўсяго гэтага трэба дадаць, што аржышча зразу мелка ўзаранае, увосені даецца добра пераараць на глыбока, а мароз гэту абробку дакончывае.

Але гдзе паша? — Вось-жа пашу запасіць сабе паступовы земляроб не з пустазельля, але з сумысьля дзеля гэтага засяванай мяшанкі. Надаецца да гэтага перадусім мяшанка азімай гэтак званай касматай вікі (vicia villosa) з жытам. На гэктар высейваецца 60-70 кг вікі і праз тыдні два, калі ўжо віка абыйдзе, у яе ўсейваецца 60 кг. жыта. Гэтная мяшанка дае вельмі раньнюю пашу, а каб паша была ўсьцяж сьвежай, мяшанка ня сеецца ўся адразу, але паступова, загонамі, праз тыдзень —два пасьля сябе. — Першы засеў трэба сеяць у нашым клімаце ўжо ў другой палове м-ца жніўня.

*П ік*

# Жывакост касматы — добрая паша.

У папярэднім (5—6)нумары „Самапомачы", у стацьці „Сьвірэпка і асот", была гутарка аб тым, як шкодны, для яравых засеваў асабліва, рознае дзікое зельле. Там-жа зазначана было, што аднэй з перашкод дакладнага выгубленьня гэтага пустазельля ёсьць пракананьне значнага ліку нашых вясковых гаспадынь, што яны ня мелі-б чым карміць улетку парасят, калі-б ня было ў ярыне досыць сьвірэпкі ці інш. пустазельля. Ня можна сказаць, каб у гэтым праканаваньні гаспадыняк ня было праўды. З другога боку аднак праўда і тое, што пустазельле ёсьць вельмі благім кормам, які ў дадатку каштуе вельмі і вельмі дорага. Высновак з гэтага мусіць быць наступны: усякае пустазельле, а знача і сьвірэпку, трэба як найстараньней у час губіць, а на пракорм летні сьвіней і скаціны засяваць патрэбны кусок поля адпаведнай травой ці кармовай мяшанкай. Для сьвіней улетку вельмі адпаведным зьяўляецца касматы жывакост.

Паходзіць жывакост з Каўказу і да нас дастаўся праз Англію і Данію. Расьціна гэта трывалкая і вельмі лёгка размнажаючаяся. Ад раньняй вясны і да познай восені дае ён шмат сачыстай — можа аж за сачыстай — пашы; няпераборлівы ў месцы і расьце ўсюды, за выняткам месц мокрых, або сусім сухіх. Ценю не баіцца, расьце дзеля гэтага на розных „клінох" у садку, каля плоту і ўсюды там, дзе звычайна расьце крапіва, лебяда, лапухі. Расьце жывакост з карэньня і раз засаджаны расьце праз шмат гадоў, а лісьцё, раз сьцятае на корм, хутка ўзноў адрастае. Лісьцё жывакосту мае форму падаўгаватага эліпсу (яйца), паросшае валасьсём, шорсткае пры датыканьні, вельмі крухое. Корань жывакосту паверху рудаваты, а ўсярэдзіне белаваты, пускае расткі.

Размнажаецца жывакост з кораня двух ці трохлетней расьціны. Корань гэткі рэжацца на кускі па 5—7 сантымэтраў (тры пальцы) і садзіцца ў прыгатаваную зямлю на глыбку 5—8 см. У некаторых мясцох садзяць жывакост за плугам, як бульбу. Рады жывакосту не павінны быць гусьцейшымі, як паўмэтра (50 см). Звычайна садзіцца жывакост раньняй вясной — прымаразкаў не баіц-

ца — покуль у зямлі ёсьць яшчэ шмат вогкасьці. У першым годзе расьце ён яшчэ вельмі памалу і дае корм толькі ў другой палове лета. Наагул-жа за першае лета патрабуе жывакост вельмі шмат дагляду, каб магчы хутчэй разрасьціся і заглушыць усякае пустазельле. А і пазьней бывае ён удзячны за спульхненьне зямлі паміж радоў і за пагнаеньне. На другую вясну толькі дае ўжо жывакост шмат пашы, бо пазваляе на 4-5 разовы пакос.—Апрача веснавога высаджваньня жывакосту, знаюць яшчэ і высаджваньне летняе, а ўласьціва васеньняе — у м-цы жніўні: у гэткім разе вясной наступнага году жывакост вельмі разрастаецца.

Скармліваецца жывакост сьвіньмі ў сьвежым стане, як сьвежа-зялёная сечка.

С. Б.—і.

# Саліць ці не саліць?

Дакучлівыя дажджы сёлетняга лета змушаюць гаспадароў-землярабаў хапацца кожнай магчымасьці, кожнага спосабу, які-б памог высушыць і захаваць сена і асабліва канюшыну. Адным з гэткіх спосабаў ёсьць саленьне, бо соль ня толькі дадае для пашы смаку, але і затрымоўвуе ў ёй усякае гніцьцё. Мова тут перадусім аб саленьні сена пры складаньні ў стагі ці ў гумне. Перасыпаецца яно тады сольлю, пры чым на кожныя 100 кілё (6 пудоў) сена мяркуецца 2 кілё солі.

Ёсьць апрача таго і іншы спосаб саленьня, даражэйшы, стасаваны аднак з добрым скуткам у тых краёх, дзе дажджы звычайна вельмі дакучаюць і дзе трэба стасаваць усё, што толькі памагае захаваць пашу ад загубы. Вось-жа ў гэткіх прыморскіх краёх соляць ня толькі прасохшае ўжо сена пры складаньні яго ў стагі, але робяць гэта нават покуль сена йшчэ ляжыць на пракосах на сенажаці. Пэўна-ж, што пры гэтым шмат і шмат солі выпаласківаецца ў зямлю. Але там, дзе йнакш гэтага сена захаваць няма як, там з дарагоўляю солі не рахуюцца. Гэтак у Францыі напрыклад рабілі і праз газэты абвесьцілі наступную пробу:

Скошанае сена праз дзень (24 гадзіны) ляжала ў пракосах і калі яно зьвяла, дык на 800 клг. сена было пасыпана 12 клг. солі. Па двух днях (48 гадзінах) недасушанае гэта сена было зложана ў стог і сусім добра перахавалася.

Іншы выпадак: скошанае сена папала пад дождж. На другі дзень па касьбе было яно аднак пасолена, як і ў першым выпадку, і дзякуючы гэтаму пралежыла паўтрацтыдня сусім ня псуючыся, падчас калі разам ляжаўшае сена, але ня соленае, згніло да астатку.—Гаспадарскі розум дзеля гэта дыхтуе як найшырэй ужываць солі дзеля захаваньня пашы ад гніцьця там, дзе іншага на гэта спосабу ўжо няма. Ужываць да гэтага трэба таннай п а ш н а й солі (sól pastevna), цана якой і сягоньня нават даволі нізкая, бо выносіць усяго паўшаста (5 з паловай)граша за кілё. Пры звычайнай знача порцыі (2 кілё солі на 100 кілё сена) кошт гэткай консэрвацыі выносіў-бы 11 грашоў кожныя 200 кілё сена, або каля $8^1/_2$ граша на 1 беркавец. Кошты невялікія, а паша ня толькі захоўвуецца ад псуцьця і робіцца смачнейшай, але нават і пажыўнейшай.

А. К.

## АБАРОНА АД МОЛЯЎ.

Улетку молі нападаюць асабліва на суконную адзежу і кажухі і псуюць іх. Абарона палягаціме на гэтым: адзежу перадусім трэба добра праветрыць, а кажухі — перачасаць шчоткай пад волас. Пасьля адзежу лёгка спырсківаецца сьпірытусам, налітым прад пару днямі на тоўчаны турэцкі перац і крыху пратоўшчанага (тлустага) камфору. Гэта настойка ставіцца на пару дзён у цёплае мейсца, покуль не распусьціцца камфор. Як гэта станецца, сьпірытус з настойкі зьліваецца і ім спырсківаецца адзежа, каторая пасьля гэтага перакладаецца йшчэ газэтамі, спырсканымі звычайнай тэрпэнтынай. Гэтак прыгатаваную адзежу завіваюць у пасьцелкі нацёртыя цьвёрдым мылам, засуваюць у густы мех і хаваюць у шчыльна замкнёную скрыню, прад зачыненьнем каторай, пад века, насыпаецца найтанейшая махорка.

**Беларускія коопэратывы павінны апісываць сваё жыцьцё на бачынах САМАПОМАЧЫ.**

# Гаспадарчая хроніка.

Б а л т ы ц к а - б е л а м о р с к і к а н а л— збудавалі Саветы сіламі „салавецкіх катаржнікаў" і адчынілі ўжо анагдай для руху. Канал гэты доўгі 227 кілёмэтраў быў выкапаны за 21 месяц часу і дае магчымасьць праехаць з Балтыцкага ў Белае мора за 6 дзён часу, падчас калі дагэтуль трэба было на гэта аж 17 дзён (кругом каля Скандынавіі).

Для арыентацыі трэба зазначыць, што будова Суэзскага каналу ў 164 клм. трывала 10 гадоў. а Панамскага ў 81 клм. — 11 гадоў.

Балтыцка-беламорскі канал будзе мець для савецкай гаспадаркі вялікае значэньне. Што каштаваў ён бязьлікіх ахвяр людзкога жыцьця, аб гэтым лішне ўспамінаць, бо людзкое жыцьцё ў бальшавікоў цэніцца найтаней.

Redaktar-Vydaviec inž. A. KLIMOVIČ.
Bielaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny, Vilnia, Zavalnaja 1—3.

Досыць пала там і ахвяр беларускіх і то — пала дарма, нізашто. Ня было-б гэтага, калі-б беларусы мелі сваю дзяржаву і для яе працавалі.

— Надзвычайная дань з маемасьці ў Польшчы наложана дня 15 ліпня с. г. Наказы будуць разасланыя да 15 верасьня і ад іх няма куды адклікацца. — Польскія вайсковыя асаднікі на беларускіх землях гэтай дані плаціць ня будуць, калі яны „малазямельныя", г. зн. калі ня маюць больш як 45 гэктараў зямлі.

— Дэфіцыт Польшчы за м-ц чэрвень с. г. 22 з паловай мільёнаў зл.

## У ВІЛЬНІ.

III. Паўночны Кірмаш у Вільні і Льнярская Выстаўка пачынаюцца 26 жніўня і патрываюць да 10 верасьня с. г.

Цэны на грошы. 31 ліпня с. г. за папяровы доляр плацілі 6 зл. 54 гр., а за рубель золатам — 4 зл. 81 гр.

## ЦЭНЫ Ў ВІЛЬНІ

**паводле нотаваньняў Віленскай збажжова-таварнай і льнярскай бурсы з 31.VII.33 г. за 100 кілё; тавар сярэдняй якасьці.**

Жыта мяшанае — ад 23 да 24 зл.; пшаніца мяшаная — ад — да — зл.; ячмень на крупы — ад 18.00 да — зл.; авёс — ад — да 14.00; мука житняя 55 прац. — ад 36.00 да — зл.; мука житняя 65 прац. — ад 31.00 да — зл.; мука разовая — ад 27.00 да — зл.; мука сітняя — 27.00 зл.; мука пшонная 0000 — 57.00 да — зл.; крупы грэчныя 1/1 паленыя — 37.00 да — зл.; пансак ячменны № 3 — 38.00 — зл.; вотрубы житнія — 11.00; вотрубы пшанічныя — 12.00 — зл.; грэчка —; фасоля белая —; крупы аўсяныя — 51.

**Лён** (экспортны гуртам за 1.000 кілё на станцыі нагрузкі): лён трапаны Валожынскі — 1299.- — 1342.30; трапаны Друйскі — 1104.15 — 1147.45; трапаны Докшыцкі — 1234.50—1277.35; кудзеля Горадзенская — 1158.28 —1179.93.



## ШУКАЕЦЕ ПРАЦЫ?

У Рэдакцыі «Самапомачы» ёсьць шмат адрэсоў беларусаў-спэцыялістаў з розных галін жыцьця. — Абавязкам кожнага беларуса ёсьць свае справы паручаць выконваць сваім-жа людзям. Рэдакцыя «Самапомачы» прапануе і на далей свае ўслугі як для тых, хто гэткай працы шукае, так і для тых, хто з яе мусіць карыстацца.

На ўсякія запыты пісьмом трэба далучаць на адказ паштовую марку.

**Рэдакцыя „Самапомачы."**

## Увага! — — ЗЬМЕНА АДРЭСУ! — — Увага!

**Усе беларускія арганізацыі і інстытуцыі, што дагэтуль мясьціліся ў Вільні пры вул. Людвісарскай 1—19 (Бел. Нац. Камітэт, Бел. Інстытут Гаспадаркі і Культуры, Ц. К.-Б. Х. Д., рэд. „Бел. Крыніцы", „Studenskaj Trybuny" і інш.), а так-жа тыя, што мясьціліся пры вул. Завальнай 6—10 (Бел. друкарня ім. Фр. Скарыны, Бел. Кнігарня "Пагоня", рэд. „Шляху Моладзі" і інш.) —**

**ад 1-га жніўня с. г.**

**пераносяцца ў новае памешканьне ў Вільні пры вул. Завальнай 1.**

**(напроціў быўшага памешканьня беларускай друкарні).**

*Pierasyłka apłačana ryčałtam.*



*CANA NUMARU 40 HRAŠOŬ*